# РЭЛІГІЙНАСЦЬ ХРЫСЦІЯН СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСІ

***Г.С. Новік***
*ДУА № 1 імя С. І. Грыцаўца, Баранавічы*

Хрысціянскія элементы ў мастацкай карціне свету.

Вялікімі крыніцамі мудрасці заўжды былі рэлігія і філасофія, якія кіравалі рухам чалавека ў свеце. Яны да гэтага часу складаюць спадчыну, да якой звяртаецца чалавек не толькі пры сустрэчы з цяжкімі абставінамі, але і для таго, каб надаць парадак і сэнс сваім штодзённым справам. Літаратура – тая адмысловая плоскасць, на якую праецыруюцца разнастайныя ўяўленні пра гарманічнае жыццё. На думку Г. Башляра, шляхі паэзіі і навукі першапачаткова супрацьлеглыя. Дадзены дыскурс-проба дасягнення “ўзаемадапаўняльнасці паміж паэзіяй і навукай”, супрацьпастаўлення “экспансіўнаму духу паэзіі маўклівага духу навукі”[1].

Мікола Гусоўскі пісаў у паэме “Песня пра зубра”: “Мы яшчэ дзеці ў свеце хрышчоных і верым у казкі Медэі” [6] Адсюль і вынікае “імкненне аўтара паказаць узаемны водсвет, які кладзецца аб’ектыўнымі і ўсеагульнымі ведамі на наш суб’ектыўны вопыт, і наадварот”, выявіць сляды “дзіцячага вопыту ў вопыце навуковым” [1] . “Другая наіўнасць дзяцінства”, ці, кажучы словамі У. Конана, “мудрая інфантыльнасць”, − адзін з паказчыкаў творчага патэнцыялу суб’екта, асобы ці цэлага народа [10].

Як напісаў у аднайменным вершы У. Караткевіч, “на Беларусі Бог жыве”. У вершы ёсць радкі: “І тая памяць жыве не ў царкве, а ў кожнай жыве галаве…”, што пацвярджае наступную выснову Э. Гусерля: разуменню Бога “ўласціва быць перажываемым у яго быццёвай і каштоўнаснай значнасці – як унутрана абсалютна абавязковым” [6].

Наш даследчы інтарэс скіраваны на з’явы і падзеі, адлюстраваныя ў літаратуры першай трэці XX стагоддзя – часу “ між дзвюх эпох, калі багі старых бацькоў трацяць свой аўтарытэт ці, проста кажучы, − павагу, увачч у нават малых дзяцей” [4].

Настаўнікі чалавека, як адзначаў К. Д. Ушынскі , − прырода, жыццё, навука, хрысціянская рэлігія. “Рэлігія ёсць не што іншае, як дасягненне блізкасці, роднасці”, −лічыў М. Бярдзяеў. У памяці героя Максіма Гарэцкага яскравы ўспамін пра тое, як не проста было “… адбыць гэтую дзіцячую пакуту: маленне Богу… “Выйміцца….”” – кажа маці, што мае азначаць: ва імя Айца.

“ – Выйміцца ! – голасна адгукаецца Лявонька, а пакуль маці зрыхтуецца казаць далей, ён сам сабе ціханька шэпча: “Выйміцца, акацілася аўца…””І, скоса паглядаючы на

хату, усміхаецца. І пакуль дабіраюцца да “Верую”, Лявонька …. забаўляецца – колькі можна ў рамках чалавека, пастаўленага весці гамонку з самім Богам” [4]

У экстрэмальнай сітуацыі, якой з’яўляецца вайна, асабліва відавочна, што аснова веры – рэлігійнае пачуццё, і толькі ў момант рэфлексіі яно ўсведамляецца як ідэя. Лявон Задума ў час імперыялістычнай вайны “хадзіў на малітвы і цягнуў з хрыплаватымі басамі і тэнарамі “Отча наш” або “Спасі, Господзі, людзі твоя… цягнуў ці маўчаў і горка пасміхаўся””[4].І ўсе ж такі Задума міжволі пагаджаецца з тым, што вера і звязаныя з ёй устанаўленні чалавечага жыцця ёсць элементы і паказчыкі ўпарадкаванасці і трываласці свету, якую “вайна парушае… Я і не ведаў бы, што свята, і дзявуюся, як аб гэтым помняць тут другія”[4].

Сучасныя даследчыкі адзначаюць з’яўленне ў рэлігійным полі Беларусі новага тыпу верніка – секулярнага, або партыкулярнага, які высока ацэньваючы ролю рэлігіі ў захаванні традыцый і культуры, прызначаючы маральную функцыю рэлігіі, не жыве царкоўным жыццём, што, дарэчы, найбольш характэрна для праваслаўнага насельніцтва. З гэтага вынікае, што рэлігія ўспрымаецца хутчэй як ідэалогія. Аднак ідэалогія імкнецца да маналагічнай інтэрпрэтацыі свету, якая зыходна не ўласціва для беларусаў. Аналіз літаратурных твораў дазваляе зразумець сутнасць і вытокі дадзенай з’явы.

Такім чынам, хрысціянскія элементы – неад’емны, быццёва і кантоўнасна значны складнік беларускай карціны свету, пеершапачаткова абумоўленай адметнасцю “кормячага ландшафту”, што забяспечыла ў ёй і трываласць язычніцтва. Гістарычная неадпаведнасць ідэалагічнага фактару народнаму светаадчуванню беларусаў стала прычынай падмены іх рэлігійнай і нацыянальнай саідэнтыфікацыі, а таксама ўспрымання хрысціянства пераважна ў рамках побытавай маралі як паказчыка ўпарадкаванасці і трываласці свету. Як эстэтычны феномен, хрысціянскія элементы ў творах беларускай літаратуры інтэрпрэтуюцца сродкамі, зададзенымі адпаведным гістарычным кантэкстам, з апорай на традыцыю сінтэзу ўзвышанага і зямнога.

1. Спецыфіка рэлігійнасці хрысціян сучаснай Беларусі.

Аналіз узроўню і характару рэлігійнасці беларускіх хрысціян паказвае не вяртанне да артадаксальных форм рэлігійнай свядомасці , а складванне эклектычнага “напаўрэлігійнага” тыпу масавай свядомасці, выяўляе значную розніцу па ступені рэлігійнасці паміж рознымі канфесійнымі групамі.

Чалавек, які лічыць сябе веруючым і адносіць да пэўнай канфесіі, павінен прымаць удзел у богаслужэннях, абрадах і таінствах.

Аснову хрысціянскага веравучэння складае Святое Пісанне. Кожны хрысціянін павінен ведаць і рэгулярна чытаць Біблію. Аднак сярод праваслаўных вернікаў падрабязна знаёмыя з Бібліяй толькі 28,8 % ад іх агульнай колькасці. У католікаў гэты паказчык складае 51,3 %, а ў пратэстантаў – 91,3 %. 40 % праваслаўных і 34 % католікаў чыталі Біблію адзін раз, а 1/5 праваслаўных і 1/10 католікаў знаёмыя з асноўнай крыніцай свайго веравучэння “па чутках”. Такія лічбы прымушаюць сумнявацца ў сапраўднасці іх веры.

Як высветлілася, у асноўныя дагматы той або іншай хрысціянскай канфесіі верыць далёка не кожны, хто аб’яўляе сябе прыналежным да яе.

Кідаецца ў вочы розніца паміж дастаткова высокім узроўнем веры ў асноўны дагмат хрысціянства – аб богачалавечай прыродзе Ісуса Хрыста і ўдвая ніжэйшым узроўнем веры ў іншыя аспекты зместу рэлігійнай веры. Акрамя таго, характэрнай рысай сучаснай рэлігійнай свядомасці з’яўляецца шырокае распаўсюджанне паранавуковых і парарэлігійных вераванняў.

У паняцце “рэлігійнасць” уваходзіць абавязкова такі фактар, як “устойлівыя культавыя паводзіны” – рэгулярнасць наведвання богаслужэнняў, выканання малітвеннага правіла, удзелу ў абрадах і таінствах. Рэгулярна моляцца каля 13 % праваслаўных, 18 % католікаў і 85,7 % пратэстантаў Беларусі [2] Рэгулярна наведваюць богаслужэнні 23,5 % веруючых, 61 % робяць гэта зрэдку і 15,2 % − ніколі. Яшчэ менш тых, хто ўдзельнічае ў здзяйсненні абрадаў і таінстваў сваёй рэлігіі – рэгулярна гэта робяць 20,9 % , зрэдку – 54 %, а 25,1 % у іх ніколі не ўдзельнічала [4]. Аднак паміж асобнымі групамі веруючых

існуюць значныя адрозненні, якія ў сярэднім даюць вышэйадзначаныя лічбы. Рэгулярна наведваюць богаслужэнні 19,5 % праваслаўных хрысціян, 44,7 % католікаў і 93,6 % пратэстантаў; зрэдку прыходзяць у храм 65,4 % праваслаўных , 54 % католікаў і 6,1 % пратэстантаў; увогуле не наведваюць богаслужэнні 14,8 % праваслаўных , 1,3 % католікаў і 0 % пратэстантаў [4]. З прыведзеных дадзеных добра бачна, як адрозніваюцца культавыя паводзіны сярод прыхільнікаў трох асноўных напрамкаў хрысціянства: для пратэстантаў наведванне богаслужэнняў і выкананне абрадавых дзеянняў з'яўляецца строга абавязковым. Дастаткова строгая дысцыпліна існуе і ў католікаў, у той час як для праваслаўных вернікаў характэрна эпізадычнасць праяўлення знешніх прымет рэлігійнасці.

Такая асаблівасць праваслаўных вернікаў тлумачыцца адсутнасцю кантролю з боку царквы і абшчыны, што вызваляе многіх веруючых ад выканання правіл царкоўнай дысцыпліны. Трэба яшчэ ўлічваць, што ў нашым грамадстве вяртанне да рэлігіі адбылося ў сітуацыі, калі некалькі пакаленняў людзей у сваёй большасці не мелі сувязяў з інстытутам царквы і рэлігійнай ідэалогіяй, не вучыліся ў нядзельных школах. Аднак актыўная дзейнасць царквы вядзе да росту колькасці вернікаў, чые паводзіны рэлігійна інстытуцыялізаваны. Адзначаюцца тэндэнцыі да ўзрастання рэфлексіўнасці і асэнсаванасці рэлігійных паводзін праваслаўных вернікаў: вырасла колькасць веруючых, хто наведвае богаслужэнні па рэлігійных меркаваннях і душэўнай неабходнасці [4].

Такім чынам, вылучаюцца наступныя асаблівасці рэлігійнасці хрысціян сучаснай Беларусі: 1) масавая рэлігійная свядомасць мае аморфны і супярэчлівы характар; 2) паміж рознымі канфесійнымі групамі веруючых існуюць адрозненні па ступені рэлігійнасці. 3) разам з тым сярод хрысціян Беларусі адзначаюцца тэндэнцыі павышэння агульнага ўзроўню рэлігійнасці і ўдзелу ў культавых практыках; 4) усе хрысціянскія канфесіі Беларусі маюць патэнцыял для прыцягнення новых вернікаў і павышэння ступені рэлігійнасці тых, хто ўжо ёсць. Але для гэтага іх кіраўніцтву патрэбна прыкласці значныя намаганні па актывізацыі работы з паствай і павышэння свайго аўтарытэту ў вачах грамадства.

2. Хрысціянскія матывы ў творчасці пісьменнікаў як адлюстраванне ментальнасці беларусаў

Прыкметай беларускай літаратуры ХХ стагоддзя стаў зварот пісьменнікаў да рэлігійна-хрысціянскай тэматыкі. Біблейская, хрысціянскія вобразы і сімвалы, пераасэнсаванні евангельскіх і старазапаветных сюжэтаў заўсёды з'яўляліся адной з невычэрпных крыніц паглыбленага мастацкага адлюстравання з'яў рэчаіснасці і крытэрыем мастацкага ідэалу. Хрысціянскія матывы сведчылі не толькі пра рэлігійныя перакананні пісьменнікаў, але і пашыралі ідэйна-тэматычны дыяпазон беларускага прыгожага пісьменства, садзейнічалі ўвасабленню патрыятычных ідэалаў аўтараў, звязвалі іх з агульначалавечымі каштоўнасцямі.

Выдатны рускі мысліцель Ільін Іван Аляксандравіч, выказаў думку пра тое, што: «карані сапраўднага мастацтва заўсёды маюць духоўна-рэлігійны характар» [6]. На працягу стагоддзяў рэлігія вызначала сістэму духоўных каштоўнасцей чалавека. Яна фарміравала светапоглядныя асновы жыцця беларускага народа ўвогуле. Хрысціянскія тэмы, матывы і вобразы, якія перманентна функцыянуюць у беларускай літаратуры ХХ стагоддзя, сведчаць пра яе ўзаемасувязь з сусветным і еўрапейскім літаратурным працэсам, а таксама з рэлігійнымі, культурнымі і літаратурнымі традыцыямі мінулага. Хрысціянскія матывы захавалі сваю актуальнасць і працягваюць заставацца адной з невычэрпных крыніц беларускай прозы ХХ стагоддзя.

Актыўныя пошукі літаратурай духоўных, маральных каштоўнасцей у нашай рэчаіснасці арганічна звязаны з раскрыццём вытокаў, тых духоўных здабыткаў, што былі выпрацаваны на працягу стагоддзяў.Адбываецца вельмі складанае, супярэчлівае ўзаемадзеянне традыцыйных каштоўнасцей з духоўнымі набыткамі нашага сучасніка.«Ідзе пераправерка традыцыйных духоўных каштоўнасцей, выпрабаванне іх на жыццёвасць у наш час, калі чалавеку так неабходна знайсці трывалую першааснову, каб жыць і працаваць, думаць пра будучае.І нярэдка наш сучаснік адчувае гэту першааснову ў ду-

хоўнай пераемнасці маральных сувязей, у наследаванні шматвяковых духоўных традыцый народа» [6].

Сучасныя крытыкі і літаратуразнаўцы неаднаразова рабілі спробу акрэсліць месца хрысціянскіх вобразаў і матываў у гісторыі рускай і беларускай літаратур. Гэтаму, у прыватнасці, прысвечаны артыкулы даследчыка рускай літаратуры Яўгена Рэйна: «Рай і пекла ў сусветнай літаратуры», Уладзіміра Конана беларускага даследчыка: «У пошуках страчанага Раю», «Беларуская літаратура ў кантэксце хрысціянскіх ідэалаў», таксама артыкул беларускай паэтэсы, Ірыны Эрнстаўны Багдановіч: «Аб хрысціянскіх матывах ў беларускай літаратуры» [3]. Празаікі і паэты ў розныя часы звярталіся да спрадвечных хрысціянскіх ісцін, знаходзячы ў іх збавенне ад заняпаду ў краіне, у свядомасці, у душы. У свой час выдатны рускі мысліцель Іван Аляксандравіч Ільін выказаў думку пра тое, што карані сапраўднага мастацтва заўсёды маюць духоўна-рэлігійны характар. «Хрысціянскія матывы ў творах пісьменнікаў XX стагоддзя паглыбляюць анталагічныя даследаванні асобы, пашыраюць магчымасці мастацкага выяўлення псіхалогіі індывіда, спрыяюць актуалізацыі твораў» [2].

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Башляр, Г. Психоанализ огня / Г. Бащляр / / Всемирная философия. XX век / авт.-сост. А. П. Андриевский. – Минск : Харвест, 2004. – С. 108−118.

2. Бельскі, А. І.Рэлігійна-хрысціянскія матывы ў паэзіі сучаснай літаратуры; Хрысціянства ў гістарычным лёсе беларускага народа : зб. Навук. Артыкулаў. – Гродна, 2008. – С. 424 – 429.

3. Богданович, И. О христианских мотивах в белорусской литературе / И. Богданович // Нёман. – 1998. – № 1. – С. 221 – 242.

4. Ванькові, А. В. Мастацкае асэнсаванне хрысціянскіх вобразаў і матываў у творчасці М. Башлакова: Вобразна-эстэтычны аспект нацыянальнай мастацкай свядомасці: зборнік навуковых артыкулаў выкладчыкаў кафедры беларускай літаратуры. – Мазыр, 2008. – С.3 – 9.

5. Гарэцкі, М. Прысады жыцця: Апавяданні, аповесці / М. Гарэцкі; уклад. Т. Голуб. – Мінск: Маст. Літ, 2003. – С. 313 – 433.

6. Гусоўскі, М. Песня пра зубра / М. Гусоўскі ; пер. на беларускую мову Я. Семяжона. – Мінск: Маст. Літ, 1980. – 192 с.

7. Гуссерль, Э. Философия как строгая наука / Э. Гуссерль // Всемирная философия. XX век / авт-сост. А. П. Андреевский. – Минск: Харвест, 2004. – С. 349 – 366.

8. Жук, І. В. Матыўная прастора беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя: манагр. / І. В. Жук. – Гродна: ГрДу, 2009. — 35 с.

9. Конан, У. Грамадска-эстэтычныя ідэалы беларускай літаратуры XIX-XX стагоддзяў / У. Конан // Полымя. – 2000. – №2. – С. 231 – 252.